Элеанора СТАРАСЦЕНКА

Праваслаўнае ваеннае духавенства на тэрыторыі Беларусі пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 года

Падзеі Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый прынеслі карэнныя змены ў тагачаснае грамадства, значным чынам паўплывалі яны і на становішча такой спецыфічнай сацыяльнай групы, як ваеннае духавенства.

Падчас Першай сусветнай вайны ў арміі Расійскай Імперыі служылі святары розных канфесій, якія задавальнялі рэлігійныя патрэбы вайскоўцаў. Абсалютную большасць складалі праваслаўныя святары, якія падпарадкоўваліся ведамству протапрэсвітэра ваеннага і марскога духавенства на чале з Г.І.Шавельскім. Усяго за 1914—1918 гг. на службе знаходзілася каля 5000 праваслаўных святароў, значная частка з якіх была мабілізаваная з беларускіх епархій. На тэрыторыі Беларусі ў гады вайны знаходзілася пераважна праваслаўнае ваеннае духавенства армій Заходняга фронту. Святары служылі ў палках, шпіталях, размеркавальных пунктах, артылерыйскіх брыгадах, запасных частках.

Гісторыі інстытута ваенных святароў у часы Першай сусветнай вайны і рэвалюцый 1917 г. прысвечаны шэраг даследаванняў. У працах савецкага перыяду такая ўвага была выклікана вялікай цікавасцю да розных аспектаў гісторыі Кастрычніцкай рэвалюцыі. Гэтыя працы насілі пераважна навукова-папулярны характар, а галоўнай мэтай даследчыкаў было паказаць духавенства як контррэвалюцыйную сілу, падкрэсліць адмоўную ролю царквы ў арміі. Сярод падобных публікацый можна згадаць працы Б.Кандзідава, Д.Сідарава, І.Эльвіна, В.Васіленкі[1]. У сучаснай гістарыяграфіі, прадстаўленай пераважна працамі расійскіх даследчыкаў, робіцца спроба разгледзець праблему становішча і дзейнасці ваеннага духавенства ў рэвалюцыйныя гады з розных бакоў, устанавіць аб'ектыўныя прычыны зніжэння аўтарытэту духавенства, умовы ліквідацыі ведамства протапрэсвітэра. Гэтыя пытанні разглядаюцца як у агульных працах па гісторыі праваслаўнай царквы, так і ў асобных артыкулах, прысвечаных падзеям 1917 г. Сярод аўтараў, якія цікавіліся гісторыяй праваслаўнага ваеннага духавенства падчас Кастрычніцкай рэвалюцыі і пасля яе, можна назваць К.Капкова, А.Каструкова, С.Фірсава, М.Бабкіна, М.Корзуна[2]. Пры гэтым спецыяльных гістарычных даследаванняў, прысвечаных праваслаўнаму ваеннаму духавенству на тэрыторыі Беларусі, у сучаснай гістарыяграфіі няма. Вывучыць становішча праваслаўнага ваеннага духавенства на тэрыторыі Беларусі ў 1917—1918 гг. дазваляюць заканадаўчыя акты, архіўныя матэрыялы, перыядычныя

СТАРАСЦЕНКА Элеанора Віктараўна.

Аспірантка кафедры гісторыі Беларусі і ўсходніх славян Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.А.Куляшова, магістр гістарычных навук. Нарадзілася ў Магілёве. У 2014 г. закончыла Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.А.Куляшова, у 2015 г. — магістратуру гэтага ж універсітэта. Даследуе гісторыю праваслаўнага ваеннага духавенства на тэрыторыі Беларусі. Аўтар шэрагу навуковых публікацый.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

выданні, а таксама ўспаміны сучаснікаў, напрыклад, протапрэсвітэра ваеннага і марскога духавенства Г.І.Шавельскага[3]. Адзначым, што жыццё і дзейнасць апошняга былі цесна звязаныя з беларускімі губернямі: ён нарадзіўся ў в. Дубакрай Віцебскай губерні (цяпер вёска ў Пскоўскай вобласці Расіі), закончыў Віцебскую духоўную семінарыю, некаторы час служыў святаром на тэрыторыі Беларусі.

Лютаўская рэвалюцыя сур'ёзна змяніла становішча і ўмовы дзейнасці праваслаўных ваенных святароў у дзеючай арміі. Да рэвалюцыі назіралася калі не паважлівае, то стрыманае стаўленне да іх. Але пасля адносіны да ваеннага духавенства істотна пагоршыліся, знізіўся яго аўтарытэт. Зразумела, падставы для гэтага ўзніклі яшчэ да Лютаўскай рэвалюцыі. А рэвалюцыйныя падзеі выявілі ўсе недахопы ў службе святароў, у іх адносінах з вайскоўцамі, асабліва з салдатамі. Адным з такіх важных недахопаў было абавязковае наведванне вайскоўцамі набажэнстваў. Уключэнне, адпаведна з Уставам воінскай службы, царкоўных службаў у распарадак дня вайсковай часткі зрабіла іх фармальным мерапрыемствам. Таму абвешчаная пасля Лютаўскай рэвалюцыі свабода сумлення і адмена абавязковага наведвання царкоўных службаў заканамерна прывялі да скарачэння колькасці іх наведвальнікаў у арміі. Набажэнствы ладзілі ў вольны час, але салдаты аддавалі перавагу адпачынку ці наведванню выступленняў вандроўных акцёраў. Часам на царкоўную службу прыходзіла не больш за дзесяць чалавек. Так, беларускі гісторык М.Корзун адзначае, што сярэдняя колькасць наведвальнікаў набажэнстваў пасля Лютаўскай рэвалюцыі зменшылася з 200—400 чалавек да 13—20[4].

Істотнай прычынай пагаршэння адносінаў салдат да святароў было ўспрыманне іх як афіцэраў. Падставы для гэтага былі: становішча святароў прыраўноўвалася да афіцэрскага, часта яны жылі ў лепшых умовах, чым салдаты, і харчаваліся разам з афіцэрамі. Да таго ж не ўдзельнічалі ў баявых дзеяннях, а толькі блаславлялі на гэта салдатаў, заклікалі выконваць загады. Адзначым, што паміж святарамі і афіцэрамі таксама даволі часта ўзнікалі непаразуменні і канфлікты. Але складаныя адносіны паміж духавенствам і афіцэрствам не цікавілі салдат: вайна цягнулася доўгі час, становішча простых вайскоўцаў пагаршалася. Вінаватымі ў гэтым у вачах салдат сталі афіцэры і святары, якія ўвасаблялі стары рэжым. Хаця пры гэтым у справаздачы за 1917 г. штабны святар 10-й арміі протаіерэй І.Трэйераў адзначае, што ўсё ж адрозненні былі: калі да афіцэраў з боку салдат выказвалася злосць, нянавісць, пагарда, то да святароў яны ставіліся абыякава, з іроніяй, часам маглі абразіць словам[5]. Прытрымліваючыся палітыкі Часовага ўрада, святары працягвалі падчас пропаведзяў гаварыць аб вернасці прысязе, аб неабходнасці вядзення вайны да перамогі і захавання дамоўленасцяў з краінамі-саюзніцамі. Калі ў пачатку вайны гэтыя размовы сярод салдат успрымаліся спакойна, то пасля рэвалюцыі яны нярэдка выклікалі абурэнне і агрэсію, што прыводзіла да зрыву пропаведзяў, да спрэчак, пагроз, і нават спроб фізічнай расправы са святарамі[6]. Пагаршэнне стаўлення да святароў з боку салдат было выклікана не толькі парадкамі армейскага жыцця ці іх незадавальненнем сваім становішчам. Вялікую ролю ў зніжэнні аўтарытэта ведамства протапрэсвітэра ваеннага і марскога духавенства іграла маральнае аблічча і ўзровень падрыхтоўкі святароў. Вялікая колькасць іх, асабліва тыя, хто трапіў у армію з епархій, былі непадрыхтаваныя да службы ў войску, паводзілі сябе не адпаведна духоўнаму сану. Гэта адбілася на аўтарытэце як асобных святароў, так і ўсяго ведамства. У выніку пасля Лютаўскай рэвалюцыі духавенства імкліва губляла падтрымку сваёй паствы і ўспрымалася ёй як перажытак старога рэжыму і контррэвалюцыйная сіла. Не адчуваючы неабходнасці ў ваенным духавенстве, многія салдаты выступалі за іх выдаленне з вайсковых частак і ўстаноў, закрыццё цэркваў і перадачу іх памяшканняў на іншыя патрэбы.

Ведамства протапрэсвітэра спрабавала аздаравіць сітуацыю, прыняць меры для павышэння аўтарытэту ваенных святароў сярод вайскоўцаў, захаваць гэтую пасаду ў штатах вайсковых частках і ўстаноў. Гэта абмяркоўвалася 1—11 ліпеня 1917 г. на Усерасійскім з'ездзе ваеннага і марскога духавенства ў Магілёве. Прадстаўнікі духавенства ўсіх франтоў, флатоў і служачых ведамства, выпрацавалі агульную пазіцыю ў дачыненні да Часовага ўрада, Устаноўчага схода, адносінаў да палітычных партый і іх падтрымкі. Таксама былі ўзгодненыя тэзісы ў дачыненні да найбольш важных для вайскоўцаў пытанняў: вайны і міру, 8-гадзіннага працоўнага дня, смяротнага пакарання і іншага. Гэтыя тэзісы рэкамендавалася выкарыстоўваць у размовах з салдатамі. Было прынята рашэнне зрабіць выбарнымі пасады ад благачынных да протапрэсвітэра, распрацаваныя палажэнні аб новых пасадах і саветах святароў (на ўзроўні корпуса, вайсковай акругі). Абмяркоўваліся меры абароны святароў у выпадку іх звальнення. Прынятыя з'ездам рашэнні мелі прагрэсіўны характар, былі накіраваныя на значнае рэфармаванне ведамства, аднак кастрычніцкія падзеі не дазволілі іх рэалізаваць[7].

Восенню 1917 г. святарам, якія засталіся служыць у арміях Заходняга фронту, удалося прыстасаваць культавую і пазакультавую дзейнасць да новых умоў. Яны служылі ў цэрквах для нешматлікай паствы, абнавілі спіс літаратуры, якую прапаноўвалі салдатам для чытання, перагледзелі падыходы да пропаведзяў. Многія святары ўдзельнічалі ў працы палкавых і шпітальных саветаў, салдацкіх камітэтаў. У кастрычніку 1917 г. штабны святар 10-й арміі І.Трэйераў у лісце да галоўнага святара армій Заходняга фронту адзначаў, што працаваць прадуктыўна духавенства можа, але для гэтага неабходна ўзмацніць пастырскую дзейнасць[8]. Аднак прыход да ўлады бальшавікоў перакрэсліў усю праведзеную армейскім духавенствам на працягу 1917 г. працу, накіраваную на ўмацаванне свайго аўтарытэту ў войску. Бальшавіцкая пазіцыя адносна ролі рэлігіі ў грамадстве была сфармуляваная даўно. Яшчэ ў праграме РСДРП ад

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

1903 г. змяшчалася палажэнне аб неабходнасці аддзялення царквы ад дзяржавы[9]. Удзел праваслаўнай царквы у жыцці грамадства планавалася значна абмежаваць. Што тычыцца інстытута ваеннага духавенства, то яго ў хуткім часе збіраліся скасаваць, а маёмасць канфіскаваць.

У першыя тыдні пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі бальшавікі імкнуліся праводзіць у дачыненні да царквы і Святейшага Сінода стрыманую палітыку. Аднак у арміі, найбольш схільнай да рэвалюцыйных ідэй і натхнёнай перамогай бальшавікоў, такой стрыманасці не было. Салдаты армій Заходняга фронту масава пераходзілі на бальшавісцкія пазіцыі, дэманстравалі яшчэ большае непрыманне ваеннага духавенства ў сваім асяроддзі: *"вся 10-я армия бурно и стойко стала за большевизм. В первую очередь началось переизбрание всех комитетов, а с ними и переоценка симпатий и отношений, в том числе и к духовенству... во всех учреждениях, отделениях, канцеляриях и даже в местах богослужения появились "властные" контролеры"*[10]. Цяпер салдаты варожа ўспрымалі Часовы ўрад, а паколькі святароў лічылі выразнікамі яго волі, то іх становішча зноў пагоршылася. Цікава, што на Заходнім фронце нават сярод святароў былі тыя, хто называў сябе бальшавікамі. Напрыклад, святар 533-га Новамікалаеўскага палка Сакольскі прасіў палкавы камітэт вярнуць яго на службу, бо ён быў звольнены за спачуванне бальшавізму: *"уход мой из полка был вызван не личным желанием перехода, а под давлением донесения со стороны неизвестных лиц и учреждений за якобы враждебную (с тенденцией к большевизму) работу в полку... Я беспрекословно подчинился своему духовному начальству, веря в конечное торжество правды и идеалов"*[11]. А святар Валасовіч, па заключэнні афіцэрскай супольнасці 124-га пехотнага Варонежскага палка, называў сябе цэнтральным бальшавіком, быў звольнены з пасады за адпаведную прапаганду, але спрабаваў працягваць агітацыю[12].

Дзейнасць святароў пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі зводзілася толькі да правядзення набажэнстваў. Нетрываласць становішча сярод вайскоўцаў вымусіла іх стрымлівацца ад пропаведзяў і гутарак з салдатамі, асабліва на тэму вайны і міру. Пачасціліся канфлікты, назіраліся выпадкі прымянення фізічнай сілы ў дачыненні да ваеннага духавенства: так, у лістападзе — снежні 1917 г. у 10-й арміі за спробу тлумачыць сацыялізм з пункту гледжання Евангелля былі збітыя двое святароў[13]. А штабнога святара гэтай арміі салдаты нават планавалі забіць: *"Лично меня за проповеди в храме, освещающие вопросы социализма с точки зрения евангелия — конспиративно было решено убить, о чем меня ночью секретно оповестили местные жители"*[14]. Даследчык А.Каструкоў пісаў, што ў 1917—1918 гг. многія ваенныя святары галілі бароды, пераапраналіся ў салдацкую форму і беглі з фронту, ратуючыся ад расправы[15]. Ускладнілася арганізацыя дывізійных сходаў ваеннага духавенства: яны фінансаваліся з казны (напрыклад, аплачвалася дарога святароў да месца збору), і таму камандзіры частак вырашалі не выдзяляць сродкі і адмаўлялі ў правядзенні такіх мерапрыемстваў. Гэта перашкаджала духавенству абмяркоўваць арганізацыю дзейнасці ў новых ўмовах, не дазваляла каардынаваць намаганні ў захаванні свайго аўтарытэту сярод вайскоўцаў.

"Дэкрэт аб міры" і перамір'е з Германіяй паскорылі працэс расфарміравання воінскіх частак, а разам з тым і ліквідацыю пасад святароў. Святар лазарэта 62-й пяхотнай дывізіі К.Зянковіч, мабілізаваны з Гродзенскай епархіі, паведамляў у канцы лістапада 1917 г., што з-за расфарміравання яго лазарэта ён губляе месца службы, а вярнуцца ў епархію не можа з-за акупацыі яе тэрыторыі[16]. Некаторыя гублялі працу з-за перафарміравання палкоў па нацыянальнай прыкмеце: святар К.Бекарэвіч у снежні 1917 г. пісаў галоўнаму святару Заходняга фронту што яго полк украінізуецца і што ён, як беларус, павінен яго пакінуць, і прасіў перавесці яго ў іншую частку, пажадана ў нацыянальны беларускі полк[17]. Скарачэнне колькасці вайсковых святароў адбывалася і з-за іх палітычных перакананняў. Звальнялі тых, хто не падтрымаў адкрыта ўладу, выказваў прыхільнасць да самаўладдзя і Часовага ўрада. Так, святара 522-га палявога шпіталя Цімінскага звольнілі толькі за тое, што ён не выказаў адкрыта сімпатыю да бальшавізму[18]. Каманда 210-га палявога шпіталя ў снежні 1917 г. выступіла з ініцыятывай ліквідаваць пасаду святара: *"К сожалению, среди моей новой духовной паствы,* — пісаў святар Р.Радзікорскі, — *есть враги церкви Христовой и ее верных служителей, которые заразились современным неверием, произволом и насилием и не желают слушать пастырские наставления и вразумления. Эти заблудшие овцы — небольшая часть госпитального комитета — решили, что им совсем не нужен никакой священник и возбуждают потому теперь дело об упразднении в госпитале должности священника"*[19]. За прапановы больш рупліва ставіцца да сваіх абавязкаў і "не захапляюцца новымі свабодамі" ў канцы лістапада 1917 г. была ініцыяваная справа аб звальненні святара 4-й брыгады дзяржаўнага апалчэння Н.Магілевіча[20]. А благачынны 4-й пяхотнай дывізіі С.Палякоў прасіў аб адстаўцы сам: *"Оставаться дальше — это значит благословлять самозванцев-захватчиков власти и предателей Родины. Совести никогда не продавал и хочу сохранить ее чистой"*[21]. Падобныя выпадкі мелі месца як у войсках Заходняга фронту, так і на іншых франтах. Па рашэннях Другога Усерасійскага з'езда ваеннага і марскога духавенства галоўныя святары франтоў павінны былі пры наяўнасці месцаў прымаць на службу звольненых святароў з іншых франтоў. Аднак на практыцы здзейсніць гэта не атрымалася, бо колькасць звольненых святароў павялічвалася, а колькасць месцаў для іх змяншалася. Так, калі ў маі 1917 г. на Заходнім фронце служылі амаль 750 святароў, то к снежню 1917 г. іх колькасць зменшылася да 400[22].

Канчаткова ведамства ваеннага і марскога духавенства было ліквідаванае 16 студзеня 1918 г. загадам народнага камісарыята па ваенных справах

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

"Аб расфарміраванні ўсіх упраўленняў духоўнага ведамства". Усе святары ўсіх веравызнанняў падлягалі звальненню са службы ў ваенным ведамстве, а ўсе іх праўленні — расфарміраванню[23]. Па меркаванні некаторых даследчыкаў, гэты дэкрэт толькі канстатаваў масавае звальненне большасці святароў з расійскай арміі[24]. Важным момантам было тое, што салдацкія камітэты па жаданні вайскоўцаў маглі захаваць святара, пры гэтым сродкі на яго ўтрыманне павінны былі шукаць самі. Але так не адбылося, і некалькі тысяч праваслаўных святароў апынуліся без працы. Яны павінны былі вярнуцца ў епархіі, у якіх служылі раней. Калі пераважная большасць кадравых святароў былі прадстаўнікамі маларускіх губерняў і паўночна-заходніх рэгіёнаў краіны, то сярод камандзіраваных на часовую службу даволі шмат было прадстаўнікоў з беларускіх зямель, асабліва высяленцаў з акупаваных германскімі войскамі тэрыторый, добраахвотнікаў[25].

Памесны сабор Рускай праваслаўнай царквы, які працаваў са жніўня 1917 па верасень 1918 г. падняў пытанне аб мерах падтрымкі ваенных святароў, *"лишившихся своих мест и не имеющих вместе со своими семьями куска хлеба"*[26]. На думку яго ўдзельнікаў, дапамогу павінны былі аказаць епархіяльныя кансісторыі: яна зводзілася да прыярытэтнага ўладкавання на свабодныя месцы ў прыходах. Але мала хто спадзяваўся на службу ў епархіях. Калі мабілізаванае ў армію на перыяд вайны (пазаштатнае) духавенства мела якую-небудзь сувязь з прыходамі, магло вярнуцца на старое месца службы (асабліва, калі духоўная кансісторыя гарантавала захаванне месца службы падчас камандзіравання ў армію), то штатныя святары ведамства протапрэсвітэра даўно страцілі сувязь з імі. *"Ликвидируя свои дела в полку,* — пісаў святар А.Вішнякоў на старонках газеты "Церковно-общественная мысль", — *едет иерей Божий в епархию, с которой связь давно порвана, где его основательно уже забыли, едет в поисках места... Пока пройдет его кандидатура куда-либо, пока подвергаемый "пробе" избирателями, он найдет себе приход, сколько мук испытать придется!"*[27]. На вакантныя месцы прызначаліся спачатку епархіяльныя кандыдаты, потым — пазаштатнае ваеннае духавенства, і ўжо пасля — усе астатнія. Протапрэсвітэр таксама прызнаваў, што ваеннае духавенства для епархій чужое і непатрэбнае і не можа разлічваць на атрыманне пасад, з-за чаго застаецца без сродкаў да існавання[28].

29 студзеня 1918 г. протапрэсвітэр ваеннага і марскога духавенства Г.Шавельскі пісаў у народны камісарыят па ваенных справах, што становішча былых ваенных святароў — на той час іх налічвалася 3700 чалавек — вельмі кепскае. У сувязі з гэтым, а таксама з улікам заслуг у Першай сусветнай вайне протапрэсвітэр прасіў народны камісарыят хаця б на некалькі месяцаў падтрымаць звольненых матэрыяльнай дапамогай, пакуль яны ўладкуюцца на новых месцах службы. Памесны сабор таксама прасіў дапамагчы тэрмінам на 6 месяцаў. У адказ з боку дзяржавы ўсяму праваслаўнаму ваеннаму духавенству было выдадзена 50 000 рублёў за студзень — люты 1918 г.[29]. Гэта была ўся дапамога, якую ўлады вырашылі аказаць, і, зразумела, яна была недастатковай для такой колькасці звольненых святароў.

Протапрэсвітэру звольненыя святары не раз паведамлялі аб жаласным матэрыяльным становішчы, адсутнасці сродкаў для існавання і прасілі аб дапамозе. Просьбы мелі пад сабой падставы: на працягу ўсёй вайны святары рабілі ахвяраванні на выпадак неабходнасці ў матэрыяльнай падтрымцы ім і іх сем'ям у будучыні. Вось толькі ў адпаведнасці з дэкрэтам Народнага камісарыята па ваенных справах "Аб расфарміраванні ўсіх упраўленняў духоўнага ведамства" ад 16 студзеня 1918 г. уся маёмасць і царкоўныя сумы ваенных цэркваў здаваліся на захаванне камітэтам вайсковых частак, а ў выпадку іх расфарміравання — вышэйшым камітэтам. А ўсе сродкі, сабраныя на асабістыя патрэбы святароў, былі перададзеныя савецкаму ўраду. Сярод канфіскаванага былі: нерухомая маёмасць (некалькі дамоў, занятых удовамі і сіротамі ваеннага духавенства; былы свечачны завод у Цвярской губерні, Есентукскі санаторый для хворых і пацярпелых у вайне служачых ведамства протапрэсвітэра, зямля пад уладкаванне пасёлка для інвалідаў), а таксама грошы (пахавальная каса, ахвяраванні на дапамогу сем'ям забітых на вайне святароў, догляд за пазаштатным духавенствам, яго ўдовамі і сіротамі, навучанне дзяцей ваеннага духавенства, адкрыццё гімназіі, прэмію імя протапрэсвітэра Жэлабоўскага*, помнік героям-святарам, пабудову пасёлка для інвалідаў з ліку духавенства)[30].

У гэтых умовах ведамства протапрэсвітэра Г.Шавельскага спрабавала вярнуць кантроль над сабранымі сродкамі. З мэтай арганізацыі дапамогі і абароны інтарэсаў ваенных святароў па ініцыятыве і духоўнага праўлення ў лютым 1918 г. быў заснаваны "Саюз служачых у ведамстве протапрэсвітэра ваеннага і марскога духавенства". Членамі саюза станавілася ўсё духавенства ліквідаванага ведамства, а таксама іншыя асобы, якія працавалі ў праўленні протапрэсвітэра на 16 студзеня 1918 г.[31]. Сюды таксама ўваходзілі пенсіянеры, інваліды, удовы і сіроты ваенных святароў. Адной з галоўных мэт саюза была названая абарона інтарэсаў яго членаў у прававых і матэрыяльных адносінах, узаемадапамога, пошук месца службы, матэрыяльная і маральная падтрымка інвалідаў ваеннага духавенства, яго ўдоў і дзяцей[32]. Спасылаючыся на тое, што сабраныя ведамствам сумы і маёмасць набываліся без дапамогі ад уладаў на сродкі святароў, і на тое, што яны не згадваюцца ў дэкрэце народных камісараў ад 23 студзеня 1918 г. "Аб аддзяленні царквы ад дзяржавы і школы ад царквы", саюз прасіў перадаць у яго рукі канфіскаванае, каб выкарыстоўваць па прызначэнні. Аднак гэтае хадайніцтва задаволена не было. На імя протапрэсвітэра і духоўнага праўлення на працягу года накіроўваліся прашэнні аб аказанні матэрыяльнай дапамогі ад былых ваенных святароў. Так, святар 91-га пяхотнага

* Першы протапрэсвітэр ваеннага і марскога духавенства.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Дзвінскага палка У.Юсціцкі ў жніўні 1918 г. пісаў протапрэсвітэру, што ўся маёмасць яго ўжо прададзеная, і без падтрымкі ўся яго сям'я памрэ з голаду ці пойдзе жабраваць[33]. З-за адсутнасці месцаў у епархіях і грошаў святары былі вымушаныя ісці на любую працу, каб пракарміць сябе і свае сем'і.

Пасля Дэкрэта аб ліквідацыі ваенна-духоўнага ведамства працягвала сваю дзейнасць толькі духоўнае праўленне. Вялікая колькасць распачатых спраў, а таксама мерапрыемствы па ліквідацыі інстытута ваеннага духавенства патрабавалі, каб яно працавала яшчэ пэўны час. Палявая канцылярыя протапрэсвітэра ў Магілёве была ліквідаваная 20 студзеня 1918 г. Была захаваная толькі пасада протапрэсвітэра ваеннага і марскога духавенства. Але няўдача ў спробе дапамагчы падначаленаму духавенству, адсутнасць умоў для далейшай працы, пагаршэнне стану здароўя вымусілі Г.Шавельскага летам 1918 г. сысці ў адстаўку. Указам Сінода ад 9/22 жніўня 1918 г. ён быў звольнены з пасады *"па хваробе"*[34]. Афіцыйна на яго месца, на перыяд ліквідацыі спраў былога ведамства протапрэсвітэра, часова выконваючым абавязкі быў прызначаны І.Мораў, які да гэтага займаў пасаду памочніка протапрэсвітэра. У канцы 1918 г. інстытут ваеннага духавенства канчаткова спыніў сваё існаванне.

Далейшы лёс ваенных святароў усіх франтоў складваўся па-рознаму: хтосьці змог знайсці месца ў епархіях і працягнуў пастырскую дзейнасць у прыходзе. Многія знайшлі іншую працу. Частка "контррэвалюцыйна настроеных" святароў паступіла на духоўную службу ў Добраахвотніцкае войска. Іх колькасць не перавышала 50 чалавек, і на кароткі час кіраўніцтва імі ажыццяўляў былы протапрэсвітэр[35]. У пошуках лепшага лёсу частка праваслаўных ваенных святароў эміграваала. Былі і тыя, хто трапіў пад рэпрэсіі.

Такім чынам, Кастрычніцкая рэвалюцыя стала вызначальнай падзеяй у гісторыі праваслаўнага ваеннага духавенства. Новая ўлада не бачыла неабходнасці ў захаванні інстытута ваенных святароў. Дэкрэтам ад 16 студзеня 1918 г. ведамства протапрэсвітэра было юрыдычна ліквідаванае, і больш за тры с паловай тысячы чалавек апынуліся без месца службы. У выніку вялікая колькасць святароў была вымушаная заняцца працай, далёкай ад святарскай, эміграваала або паступіла на службу ў Добраахвотніцкае войска, дзе інстытут ваеннага духавенства праіснаваў яшчэ нейкі час.

---

[1] Кандидов Б.П. Церковный фронт в годы мировой войны. Москва, 1929; Сидоров Д.И. Защита Родины и религия. Москва, 1963; Эльвин И. Церковь и война. Москва, 1934; Василенко В.О. Офицеры в рясах. Москва, 1930.

[2] Фирсов С.Л. Русская Церковь накануне перемен (конец 1890-х — 1918 г.). Москва, 2002; Бабкин М.А. Духовенство Русской православной церкви и свержение монархии (начало XX в. — конец 1917 г.). Москва, 2007; Бабкин М.А. Священство и Царство (Россия, начало XX в. — 1918 г.). Исследования и материалы. Москва, 2011; Капков К.Г. Памятная книга военного и морского духовенства XIX — начала XX веков. Справочные материалы. Москва, 2008; Капков К.Г. Очерки по истории военного и морского духовенства Российской империи XVIII — начала XX века: итоги к 1917 г. Москва, 2009; Кострюков А.А. Военное духовенство и развал армии в 1917 г. // Церковь и время. 2005. № 2. С. 143—196; Корзун М.С. Русская православная церковь на службе эксплуататорских классов. X век — 1917 г. Минск, 1984.

[3] Шавельский Г. Воспоминания последнего протопресвитера русской армии и флота: в 2 т. Т. 2. Нью-Йорк, 1954.

[4] Корзун М.С. Русская православная церковь на службе эксплуататорских классов. С. 227.

[5] Российский государственный исторический архив (далей — РГИА). Ф. 806, оп. 5, д. 10462, л. 45.

[6] Старостенко Э.В. Православное военное духовенство Западного фронта в период революционных преобразований 1917 г. в России // Веснік Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.А.Куляшова. Серыя А. Гуманітарныя навукі: гісторыя, філасофія, філалогія. 2017. № 2. С. 21.

[7] Старостенко Э.В. Второй Всероссийский съезд военного и морского духовенства православной церкви 1917 года // Журнал Белорусского государственного университета. История. 2017. № 4. С. 71—75.

[8] РГИА. Ф. 806, оп. 5, д. 10399, л. 9 об.

[9] История религии и свободы совести в Беларуси в документах и материалах: пособие: в 4 ч. / авт.-сост.: В.В.Старостенко, Э.В.Старостенко. Ч. 3. Могилев, 2015. С. 159.

[10] РГИА. Ф. 806, оп. 5, д. 10462, л. 44—44 об.

[11] Там жа. Д. 10319, л. 77—77 об.

[12] Там жа. Д. 10373, л. 12—13 об.

[13] Там жа. Д. 10462, л. 45.

[14] Там жа. Л. 44 об.

[15] Кострюков А. Военные священники в сонме новомучеников и исповедников Российских [Электронный ресурс] // Портал "Православие.ru". Режим доступа: http://www.pravoslavie.ru/44668.html#_ftn14. Дата доступа: 16.10.2016.

[16] РГИА Ф. 806, оп. 5, д. 10315, л. 369.

[17] Там жа. Д. 10321, л. 878.

[18] Там жа. Д. 10462, л. 45.

[19] Там жа. Д. 10319, л. 133 об. — 134.

[20] Там жа. Д. 10321, л. 769 об.

[21] Там жа. Д. 10319, л. 128.

[22] Там жа. Д. 10392, л. 184—193.

[23] Собрание узаконений и распоряжений правительства за 1917—1918 гг. Москва, 1942. С. 260

[24] Кострюков А.А. Военное духовенство и развал армии в 1917 г. С. 169.

[25] Капков К.Г. Памятная книга военного и морского духовенства XIX — начала XX века. С. 42; Євсєєва Т.М. Православне військове духовенство: відносини з владою на перехресті епох // Проблеми історії України: факти, судження, пошуки: міжвідомчий зб. наук. пр. Київ, 2013. С. 308.

[26] Государственный архив Российской Федерации. Ф. 3431, оп. 1, д. 87, л. 5.

[27] Вишняков А.В. Молчать больше нельзя // Церковно-общественная мысль. 1917. № 11-12. С. 35.

[28] РГИА. Ф. 806, оп. 5, д. 10526, л. 1 об.

[29] Соколов А.В. Государство и Православная церковь в России, февраль 1917 — январь 1918 г.: дис. ... д-ра ист. наук: 07.00.02. Санкт-Петербург, 2014. С. 713.

[30] РГИА. Ф. 806, оп. 5, д. 10516, л. 16.

[31] Там жа. Л. 10.

[32] Там жа. Л. 11.

[33] РГИА. Ф. 806, оп. 5, д. 10507, л. 50.

[34] Там жа. Д. 10526, л. 37.

[35] Шавельский Г. Воспоминания последнего протопресвитера русской армии и флота: в 2 т. Т. 2. С. 324.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова